Вельмі выгадны міф

Сёлетняя зіма выдалася цяжкай для многіх кліматолагаў. Толькі яны пераканалі ўсіх, што трэба тэрмінова ратаваць Зямлю ад глабальнага пацяплення, раставання леднікоў і іншых "жахаў", як прырода паставіла рэкорд па працягласці і сіле маразоў практична ва ўсім Паўночным паўшар'і. Зрэшты, як высвятляецца, для некаторых людзей сюрпрыз не быў такім ужо і нечаканым. З пачатку тыдня ў свеце набірае абароты скандал, звязаны з, як прыгожа напісала адна брытанская газета, "не зусім карэктным выкарыстаннем даверуда звання вучонага".

Фармальна ўсё пачалося яшчэ напрыканцы лістапада 2009 года, калі хакеры змясцілі ў інтэрнэце тысячы дакументаў і электронных пісьмаў, выкрадзеных з сервераў Цэнтра па вывучэнні клімату Універсітэта Усходняй Англіі — вядучай навуковай арганізацыі, якая займаецца вывучэннем глабальнага пацяплення. Апублікаванае ж нядаўна інтэрв'ю з Філам Джонсам, які больш як дзесяць гадоў быў кіраўніком цэнтра, пачынаючы з 1996 года, стала апошняй кропляй. У ім Джоне прызнаў, што рост тэмператур у апошнія 15 гадоў быў статыстычна нязначным. Больш за тое, вучоны адзначыў, што аналагічныя перыяды змянення клімату адзначаюцца не ўпершыню: на планеце бесперапынна цяплела, напрыклад, з 1919 па 1940 год і з 1975 па 1998-мы. Спецыяліст таксама прызнаў, што пачынаючы з 2002 года сярэднегадавыя тэмпературы падаюць на 0,12 градуса за дзесяцігоддзе.

Некаторыя з апублікаваных у мінулым годзе перадалі скептыкам падставы сцвярджаць, што кліматолагі наўмысна скажалі даныя назіранняў, каб стварыць ілюзію росту тэмператур. Адным з неабвяргальных доказаў этага намеру даследчыкаў крытыкі тэорыі глабальнага пацяплення палічылі ліст, у якім Джонс расказваў аднаму са сваіх калег аб праведзеным труку, які дазволіў скрыць паніжэнне тэмператур, відавочнае з зыходных даных назіранняў.

Яшчэ адзін непрыемны факт, які меў месца пасля публікацыі дакументаў: кліматолагі з Цэнтра па вывучэнні клімату свядома адмовіліся прадастаўляць зыходныя даныя назіранняў па запытах скептыкаў, хаця былі выдатна праінфармаваны аб тым, што падобныя дзеянні парушаюць дзеючы ў Вялікабрытаніі Акт аб свабодзе інфармацыі. Больш за тое, жадаючым атрымаць неапрацаваную інфармацыю было заяўлена, што яна была выдалена з камп'ютараў, таму што "займала надта шмат месца".

Таксама высветлілася, што не толькі англійскія змагары з глабальным пацяпленнем грашаць на імкненне падагнаць факты пад сваю тэорыю. На фоне скандалу на погляд публікі была вынесена справаздача Міжурадавай групы экспертаў па змяненні клімату (IPCC) за 2007 год, на якой базіруецца значная частка аргументаў "зялёных". Асабліва дзіўнай часткай прызнаны прагноз хуткасці раставання леднікоў у Пмалаях. У справаздачы сцвярджалася, што плошча гімалайскіх леднікоў скарачаецца катастрафічна хутка, і самая высокая горная сістэма Зямлі цалкам вызваліцца ад лёду да 2035 года. У наступным сказе гаварылася, што плошча леднікоў у Гімалаях ссароціцца з 500 тысяч да 100 тысяч квадратных кіламетраў. Ужо супастаўленне гэтых двух сказаў выклікае пытанне: ці цалкам знікнуць леднікі, ці захаваюцца 20%? (Пры тым дакладна вядома, што агульная плошча гімалайскага лёду не перавышае сёння 33 тысячы квадратных кіламетраў.)

Як высветлілася, пры складанні справаздачы эксперты IPCC выкарыстоўвалі артыкул з індыйскага навукова-папулярнага часопіса Down to Earth, які, канечне, не рэцэнзуецца. Карэспандэнт часопіса браў інтэрв'ю ў расійскага вучонага Уладзіміра Катлякова, які распавёў, што, паводле яго падлікаў, да 2350 года плошча ўсіх непалярных леднікоў паменшыцца з 500 тысяч да 100 тысяч квадратных кіламетраў. Шляхам дзіўных змяненняў з 2350 года ў выніку атрымаўся 2035-ты, а ўсе непалярныя леднікі (гэта значыць на ўсіх гарах у свеце) ператварыліся ў выключна гімалайскія. Але, базумоўна, для алармісцкіх загалоўкаў і

заклікаў выдзеліць яшчэ больш грошай на барацьбу з глабальным пацяпленнем — самае яно.

Дарэчы, далека не факт, што глабальнае пацяпленне, калі яно ўсе ж такі мае месца, а не з'яўляецца статыстычнай флуктацыяй, ёсць зло. Апошнія амаль два мільёны гадоў на нашай планеце чаргуюцца ледніковыя і міжледніковыя перыяды. Ледніковыя доўжацца прыблізна 100 тыс.гадоў, міжледнікоўе, у якое мы з вамі жывём, у геалогіі называецца галацэнам і доўжыцца якраз каля 10 тысяч гадоў. Канечне, гэта не азначае, што ў любы момант на планету абрынецца гіганцкі ляднік, а мільярды людзей будуць вымушаны сарвацца з месца і падацца на поўдзень. Але адмаўляць такую магчымасць, на думку многіх, нельга. І ў такім выпадку, нават калі пацяпленне ёсць, яго трэба ўсюды ўзмацняць, каб гадоў праз 100—200 нашым нашчадкам не давялося на нартах прабірацца праз снег палескай тундры.

Аднак праблема ў тым, што вакол глабальнага пацяплення склалася цэлая сетка структур, зацікаўленых у тым, каб чалавецтва і далей траціла грошы і рэсурсы на тое, што, магчыма, і не існуе. Не трэба думаць пра самае горшае: відавочна, сама тэорыя ўзнікла як звычайны прадукт навуковай дзейнасці, у якой хапае памылак. Але ў нейкі момант са звычайнай тэорыі яна ператварылся ў сцяг для "зялёных" змагароў з прамысловасцю і сродак выпампоўвання бюджэтных грошай для розных даследчых арганізацый. Зноў жа, адразу змянілася грамадская вага вучоных, якія займаюцца кліматам: калі да з'яўлення тэорыі цікавасць грамадства і дзяржавы да кліматалогіі, гляцыялогіі і іншых сумежных дысцыплін была невялікай і выключна прыкладной, то цяпер да іх слова прыслухоўваюцца на самым высокім узроўні, збіраюць сусветныя форумы, выдзяляюць на парадак больш сродкаў на даследаванні. Прыхільнікі тэорыі глабальнага пацяплення з навуковай школы сталі ператварацца ў секту, якая прэтэндуе на тое, каб уплываць на ўсю сусветную эканоміку. Так, адной з прапаноў на Капенгагенскім саміце па пытаннях клімату, што прайшоў у снежні мінулага года, было стварэнне пры ААН ведамства, якое б займалася пытаннямі клімату, а таксама мела б магчымасць рэгуляваць тыя галіны эканомікі, "якія аказваюць шкоднае ўздеянне на прыроду", гэта значыць, практычна на ўсё. І канечне, "зялёныя", якія прапанавалі гэты план, не забылі аб фінансаванні, запрасіўшы на гэтага "монстра" і яго праекты 1 % ад сусветнага ВУП (каля паўтрыльёнадолараў).

Перш чым прымаць нейкін рашэнні, закліканыя не дапусціць сусветных кліматычных змяненняў, пажадана было б вызначыцца з трыма паслядоўнымі праблемамі. Па-першае, ці адзначаецца сёння наогул глабальнае пацяпленне як такое (як высвятляецца, яно не абавязкова мае глабальны і доўгатэрміновы характар). Па-другое, нават калі будзе дасягнута агульная згода ў тым, што пацяпленне мае месца, узнікае пытанне, ці дакладна гэта звязана з дзейнасцю чалавека і ці можа чалавек наогул паўплываць на планетарныя працэсы. Аб'ём парніковых газаў, што выкідваюцца пры адным вывяржэнні сярэдняга вулкана, перавышае ўсё тое, што здольна выдаць сусветная прамысловасць наогул. Па-трэцяе, калі па першых двух пунктах адказ будзе станоўчым, то з'явіцца наступнае пытанне: ці магчыма павярнуць працэс назад? У рэшце рэшт, прыгатаванне фаршу з мяса мае аднанакіраваны характар. Так і тут: калі ўжо працэс пачаўся, ні з чаго не вынікае, што нават поўнае спыненне гаспадарчай дзейнасці чалавека здольнае яго спыніць.

А.Вярціскі

Источник: Настаўніцкая газета.-2010.-20 лют.-С.3.